**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за чэрвень 2017 г.

У чэрвені ў публічных бібліятэках ДУК пачаўся раённы конкурс летняга чытання “Канікулы ў бібліятэцы”. У рамках конкурсу бібліятэкі праводзяць мерапрыемствы для дзяцей і падлеткаў.

## Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу летняга чытання “Летом с книгой я дружу”

***З 4 чэрвеня па 18 чэрвеня***

На базе інфармацыйна-сэрвіснага цэнтра арганізаваны цыкл мерапрыемстваў “Канікулы ў бібліятэцы”. Вучні школ горада наведалі інфармацыйна-пазнавальныя гадзіны “Загадочный мир животных” і “Праздник к нам приходит”, віртуальнае падарожжа “Мы идем в музей!”, урок здароўя “По тропинке к доброму здоровью”, вечар адпачынку “Цветами улыбается Земля”. Мерапрыемствы суправаджаліся паказам відэапрэзентацый, праглядам кароткаметражных мультфільмаў, адгадваннем загадак.

ЦБ, 530 чал.

***4 чэрвеня***

На святочнай праграме "Страна детства на планете Земля" дзеці атрымалі магчымасць праявіць сябе на станцыях: "Творческая" ў конкурсе малюнкаў на асфальце, чытанні вершаў, выкананні песень. Станцыя "Веселое лето" захапіла дзяцей разнастайнымі гульнямі, віктарынамі, конкурсамі, спартыўнай эстафетай. "Танцевальная" станцыя запрасіла самых актыўных на дзіцячую дыскатэку. Пад канец мерапрыемства ўсе ўдзельнікі атрымалі прызы і салодкія пачастункі.

Тевельская ПБ, 27 чал.

***5 чэрвеня***

На свяце да Міжнароднага дня аховы дзяцей “Мир детства – самый лучший мир” маленькія карыстальнікі паглядзелі лялечны спектакль па правілам бяспекі і правілам дарожнага руху і прынялі ўдзел у конкурсна-гульнявой праграме “Приглашаем всех читать, фантазировать, играть!”. Свята скончылася дыскатэкай.

Дзіцячы філіял, 51 чал.

***11 чэрвеня***

У час правядзення гульнявой праграмы “Весёлый разговор на серьёзную тему” маленькія чытачы з цікавасцю сачылі за лялечным прадстаўленнем, удзельнічалі ў вясёлых гульнях, разгадвалі загадкі і адказвалі на пытанні экалагічнай віктарыны. Кніжная выстава прыцягнула ўвагу дзяцей да літаратуры, якая расказвае пра экалагічныя праблемы.

Дзівінскі філіял, 53 чал.

***З 12 чэрвеня па 22 чэрвеня***

У бібліятэцы арганізаваны цыкл мерапрыемстваў “Лялечны тэатр "Сказка" запрашае”. Дзеці паглядзелі лялечныя спектаклі “Как пчёлка лесных жителей спасала” і спектаклі па правілам бяспекі і правілам дарожнага руху, прынялі ўдзел у конкурсна-гульнявой праграме “Приглашаем всех читать, фантазировать, играть!”, “Я с книгой открываю мир природы”, у літаратурнай віктарыне “Мы будем сказки узнавать, шутить, отгадывать, играть”. У канцы мерапрыемства адбылася дзіцячая дыскатэка.

Дзіцячы філіял, 229 чал.

***12 чэрвеня***

Свята чытаючых сямей “Кнігі мы сям’ёй чытаем” сабрала маладыя сем’і вёскі Балоты. У конкурсе “Сямейны партрэт” кожная сям’я расказала аб сваіх захапленнях . Матулі раскрылі свае музычныя здольнасці у конкурсе “Песні пра сямью”, бацькі паказалі свае веды пра дзяцей у конкурсе “Ці ведаю я сваё дзіця?”. Удзельнікі мерапрыемства ўзнагароджаны дыпломамі і падарункамі.

Балоцкая ПБ, 26 чал.

***22 чэрвеня***

У бібліятэцы прайшоў урок-разважанне “Чароўная сіла добрага слова”. Дзеці разам з бібліятэкарам чыталі прытчы, глядзелі прэзентацыю “Вандраванне ў свет добрага слова”, складалі аплікацыю “Планета добрага слова”, успаміналі прыказкі і прымаўкі са словам “Дабрыня”, з задавальненнем гулялі ў “Устаў у расказ чароўнае слова”.

Батчынская ПБ, 27 чал.

## <u>Мерапрыемствы, прысвечаныя Году малой радзімы</u>

***1 чэрвеня***

Бібліятэкар запрасіла малодшых школьнікаў на краязнаўчую гадзіну “Слова пра родны кут”. Дзеці пазнаёміліся з гісторыяй заснавання пасёлка Арэхаўскі і Кобрынскага раёна ўвогуле, даведаліся шмат цікавага пра жывёльны і раслінны свет, адказалі на пытанні віктарыны, праслухалі вершы аб родным краі мясцовай паэткі Гарыст Л.І. Відэафільм “Город древний, город молодой” дапамог прысутным пазнаёміцца са славутасцямі Кобрына, пабываць у цікавых мясцінах горада.

Арэхаўская ПБ, 32 чал.

***15 чэрвеня***

На краязнаўчым круізе “Мой край родной – частица Родины большой” бібліятэкар расказала дзецям пра тое, што такое Радзіма і з чаго яна пачынаецца. Удзельнікі мерапрыемства даведаліся пра гісторыю ўзнікнення вёскі Гарадзец, зрабілі невялікую экскурсію па родных мясцінах, пазнаёміліся з гераічным мінулым і сучаснасцю роднай вёскі. Усе разам успомнілі знакамітых землякоў, якія ўславілі малую радзіму і іх заслугі перад сваімі землякамі. Увазе юных чытачоў прапанавана інтэрактыўная віктарына

“Падарожжа па Гарадзецкай ваколіцы” і агляд краязнаўчай літаратуры, прадстаўленай на выставе “Любі свой край, паважай сваю Гісторыю”.

Гарадзецкі філіял, 25 чал.

***23 чэрвеня***

У в. Тэўлі адбылося свята вуліцы “Как на деревенских именинах”, арганізаванае бібліятэкай сумесна з Домам культуры і прысвечанае вуліцы Першамайская. Жыхары вёскі малі магчамасць праслухаць расказ унучкі Аліны Уладзіміраўны Мідушэўскай пра свайго дзеда пісьменніка У. Кітаеўскага. Бібліятэкар правяла ўшаноўванне лепшых чытачоў і арганізавала выстаўку творчасці Уладзіміра Кітаеўскага “Добрая слава паэта-земляка”, дзе прысутныя і госці свята змаглі пазнаёміцца з творамі паэта.

Тевельская ПБ, 80 чал.

***25 чэрвеня***

Краязнаўчае падарожжа “Так жылі бабулі, так жылі дзядулі” вярнула ўдзельнікаў на много гадоў назад. Дзеці пазнаёміліся са старажытнымі прадметамі быту, паглядзелі работы народных майстрых, узгадалі пагаворкі. З вялікай цікавасцю ўсе прынялі ўдзел у конкурсе “Што гэта азначае?”, адгадалі загадкі.

Кіселявецкая ПБ, 47 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

***18 чэрвеня***

Кожны чацверг у рамках праекта “Разговорный клуб английского” (English Speaking Club) у інфармацыйна-сэрвісным цэнтры праходзяць пасяджэнні клуба. Тэмай чарговага заняцця сталі мультфільмы. Прагляд мультфільмаў і правядзенне пасяджэння ў гульнявой форме дапамагае ўдзельнікам праекта лепш запомніць сэнс розных слоў, спрыяе развіццю слоўнікавага запасу на англійскай мове.

ЦРБ, 35 чал.

***15 чэрвеня***

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры адбылася гадзіна творчых ідэй “Поиск и внедрение новых библиотечных форм приобщения детей и подростков к чтению”. Супрацоўнікі публічных бібліятэк раёна падзяліліся з калегамі ідэямі ў рабоце з дзецьмі і падлеткамі, пра пошук і ўкараненне крэатыўных формаў работы з юнымі карыстальнікамі, пра інфармацыйнае асяроддзе для дзяцей і падлеткаў, пра работу з дзецьмі сацыяльна-небяспечнага становішча ў летні перыяд. Разглядаліся пытанні адміністрацыйнага кіравання і метадычнага кіраўніцтва.

ЦРБ, 46 чал.

***20 чэрвеня***

Запрошаная на пасяджэнне аматарскага клуба “Ровесник” у форме гутаркі – роздума “Спыніся ля забароненай рыскі” фельчар Лукскай ўрачэбнай амбулаторыі Кушнер І. А. расказала прысутным пра ўплыў на арганізм чалавека наркатычных рэчываў і да якіх вынікаў яны прыводзяць.

Бібліятэкар падрыхтавала відэапрэзентацыю на тэму “Моладзь, закон, наркотыкі”.

Лукская ПБ, 18 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81